(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ДНУ "ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ І ФАЛЬКЛОРУ
ІМЯ К.КРАПІВЫ"

УДК 75.047(476)(091)"1900/1941"

**ГРАМЫКА**
**Марыя Валер'еўна**

# ЭВАЛЮЦЫЯ БЕЛАРУСКАГА ПЕЙЗАЖНАГА ЖЫВАПІСУ 1900 – 1941 ГГ.

Аўтарэферат
дысертацыя на атрыманне вучонай ступені кандыдата навук
па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное
мастацтва і архітэктура

Мінск, 2006

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Работа выканана ў аддзеле выяўленчага мастацтва ДНУ "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы" Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

**Навуковы кіраўнік** – доктар мастацтвазнаўста,
наместнік дырэктара па навуковай рабоце
ІМЭФ імя К.Крапівы НАН Беларусі
**В.І. Жук**

**Афіцыйныя апаненты** – доктар мастацтвазнаўства,
вядучы навуковы супрацоўнік аддзела архітэктуры
ІМЭФ імя К.Крапівы НАН Беларусі
**Т.В.Габрусь**

кандыдат мастацтвазнаўства,
дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея РБ
**В.І. Пракапцоў**

**Апаніруючая арганізацыя** – УА "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў"

Абарона адбудзецца "___"__________2006 г. у "_____" гадзін на пасяджэнні Савета па абароне дысертацый Д 01.42.02. у ДНУ "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы" НАН Беларусі (220072, Г.Мінск, вул.Сурганава, 1, корп.2, тэл. 284-23-81).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ДНУ "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы" НАН Беларусі (220072, Г.Мінск, вул.Сурганава, 1, корп.2).

Аўтарэферат разасланы "___" ____________2006 г.

Вучоны сакратар
Савета па абароне дысертацый
кадыдат мастацтвазнаўства **Н.А. Юўчанка**

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)



## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі**

Дысертацыйнае даследаванне выконвалася ў межах задання "Выяўленчае мастацтва Беларусі і славянскія культуры" (Гісторыя і культура 30) рэг.№ 20012252 дзяржаўнай праграмы "Даследаванні гісторыі мастацтва, фальклору і этнакультурных традыцый Беларусі ў кантэксце славянскіх культур, еўрапейскай цывілізацыі, глабальнага развіцця і этнаканфесійных працэсаў у сучасным свеце" ("Гісторыя і культура"), зацверджанай Пастановай Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ад 5 ліпеня 2001 г. №95 і № 89 ад 29 верасня 2003 г., якое ажыццяўляецца ДНУ "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі імя К.Крапівы".

**Аб'ект і прадмет дысертацыі**

Аб'ектам даследавання з'яўляецца пейзажны жывапіс Беларусі 1900 – 1941 гг. У кола даследавання ўваходзяць арыгіналы і рэпрадукцыі твораў, біяграфіі мастакоў, публікацыі ў тагачаснай прэсе, статуты мастацкіх устаноў, каталогі выставак.

Прадметам дысертацыі з'яўляюцца асноўныя тэндэнцыі, вобразна-тэматычныя і стылявыя асаблівасці пейзажнага жывапісу Беларусі 1900 – 1941 гг.

**Мэты і задачы даследавання**: мэтай даследавання з'яўляецца раскрыццё спецыфікі развіцця пейзажнага жывапісу ў кантэксце мастацкага і грамадскага жыцця ў Беларусі ў перыяд 1900 – 1941 гг. Для вырашэння гэтай тэмы ставяцца наступныя задачы:

- вызначыць этапы станаўлення беларускай пейзажнай школы;
- вылучыць асноўныя тэндэнцыі вобразна-тэматычнай і стылявой скіраванасці твораў пейзажнага жанру;
- выявіць асаблівасці станаўлення відаў пейзажа – гарадскі, сядзібны, індустрыяльны пейзаж і інш.;
- паказаць спецыфіку ўплыву на беларускі пейзаж актуальных для дадзенага перыяду мастацкіх плыняў;
- даць характарыстыку вобразна-тэматычным і стылістычным асаблівасцям пейзажнага жывапісу Заходняй Беларусі.

**Методыка даследавання**

Асноўным метадам даследавання абраны гісторыка-мастацтвазнаўчы, які дазваляе прадставіць развіццё беларускага пейзажнага жывапісу ў сукупнасці

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)



нацыянальных традыцый і актуальных для таго часу мастацкіх тэндэнцый, узнавіць карціну паслядоўнага развіцця беларускага пейзажа.

Прымяненне стылістычнага аналізу дазволіла выявіць асаблівасці індывідуальнага аўтарскага падыходу ў вырашэнні тэмы і вобраза, адметнасці стылістыкі асобных мастакоў. Метады сістэмнага і параўнальнага аналізу дапамаглі выявіць асноўныя тэндэнцыі і асаблівасці развіцця пейзажнага жывапісу разгледжанага перыяду.

Эмпірычнымі крыніцамі даследавання сталі працы навукоўцаў у галіне гісторыі і тэорыі беларускага, расійскага, польскага выяўленчага мастацтва.

**Навуковая навізна**

Дысертацыя ўяўляе сабой першае абагульняючае даследаванне эвалюцыі беларускага пейзажнага жывапісу 1900 – 1941 гг. На аснове сабранага матэрыялу, значная частка якога ўводзіцца ў навуковы ўжытак дысертантам, упершыню зроблена спроба комплекснага вывучэння працэсаў, якія адбываліся ў пейзажным жывапісе адзначанага перыяду, яго ідэйна-тэматычных і вобразна-стылістычных асаблівасцяў і відавой спецыфікі.

**Практычная значнасць**

Сабраны ў дысертацыі матэрыял можа стаць састаўной часткай для больш шырокага мастацтвазнаўчага даследавання беларускага пейзажнага жывапісу. Атрыманыя вынікі могуць быць выкарыстаны ў мастацтвазнаўстве як падрыхтоўчы матэрыял у абагульняючых і манаграфічных даследаваннях, якія закранаюць эвалюцыю беларускага жывапісу. Дысертацыя можа быць запатрабавана пры распрацоўцы лекцыйных курсаў па гісторыі выяўленчага мастацтва Беларусі ў лекторыях музеяў, на кафедрах культуралогіі і мастацтвазнаўства ў вышэйшых гуманітарных навуковых установах, пры падрыхтоўцы выставак.

**Асабісты ўклад аўтара**

Дадзеная работа з'яўляецца арыгінальным, самастойным навуковым даследаваннем, выкананым у аспірантуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Дысертантам сабраны і сістэматызавана вывучаны матэрыялы, звязаныя з эвалюцыяй пейзажнага жывапісу Беларусі 1900 – 1941 гг. Для выяўлення характэрных твораў вывучаны фонды НММБ і яго рэгіянальных філіялаў, БДАМЛіМ, Нацыянальнага гістарычнага архіва (арыгіналы, рэпрадукцыі і слоўныя апісанні твораў; каталогі; рэцэнзіі ў тагачасным перыядычным друку; біяграфічныя матэрыялы і інш.).

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)



Практычную значнасць уяўляе таксама ўвядзенне ў навуковы ўжытак шэрагу твораў, раней не апісаных у мастацтвазнаўчай літаратуры.

**Асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. За перыяд 1900 – 1941 гг. у беларускім пейзажы атрымалі развіццё асноўныя складнікі, неабходныя для фарміравання беларускай нацыянальнай школы пейзажа.

2. Беларускі пейзаж першай паловы XX стагоддзя характарызуецца сацыяльнай скіраванасцю. Ён чуйна адгукаецца на ўсе праявы навакольнага жыцця, робіцца выразнікам сацыяльных сімпатый і перакананняў мастака. Сацыяльная скіраванасць беларускага пейзажнага жывапісу 1-ай паловы XX стагоддзя выразна прасочваецца цягам усяго азначанага перыяду.

3. Да канца разглядаемага ў дысертацыі перыяду беларускі пейзажны жывапіс падышоў з аформленымі і развітымі разнавіднасцямі, якія мелі сваю нацыянальную адметнасць. Самымі распаўсюджанымі відамі пейзажа з'яўляліся "чысты", сельскі, гарадскі, сядзібны, індустрыяльны пейзаж.

4. У беларускім пейзажным жывапісе пачатку XX стагоддзя пераважалі рэалістычныя і познеакадэмічныя рысы. Разам з тым беларускі пейзаж, як і беларускі жывапіс у цэлым, развіваўся ў рэчышчы агульных тэндэнцый еўрапейскага мастацтва, прычым найбольшы ўплыў на яго зрабілі такія плыні, як імпрэсіянізм, постімпрэсіянізм і сімвалізм. Пры гэтым беларускі пейзажны жывапіс 1-ай паловы XX стагоддзя вылучаецца павышэннем цікавасці да вобразна-алегарычных сродкаў выразнасці. Характар вобразаў апавядальны, набліжаецца да сюжэтна-вобразнага, літаратурнага, для перадачы глыбокага філасофскага сэнсу выкарыстоўваюцца сімвалы, звязаныя з паўсядзённым навакольным асяроддзем. У цэлым вобраз прыроды ў беларускім пейзажы застаўся рэалістычным.

5. У пейзажным жывапісе Заходняй Беларусі можна вылучыць такія рысы, як экспрэсіўнасць колеру, блізкасць да народнага мастацтва, спалучэнне грунтоўнасці, матэрыяльнасці жывапісу і паэтычнасці бачання прыроды. Заходнебеларускі пейзаж з'яўляецца паўнапраўным складнікам нацыянальнага пейзажнага жывапісу.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)



**Апрабацыя вынікаў даследавання**

Дысертацыя была абмеркавана на пасяджэнні аддзела выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Асноўныя палажэнні дысертацыі прайшлі апрабацыю на навуковай канферэнцыі "Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі" (Мінск, 2005), II Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся: праблемы вывучэння і захавання ў постчарнобыльскі час" (Гомель, 2006), Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "Навейшая гісторыя (1991 – 2006): дзяржава, грамадства, асоба" (Мінск, 2006), навуковай канферэнцыі "Актуальныя праблемы развіцця сучаснай культуры" (Мінск, 2006), XIV Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Шлях да узаемнасці" (Гродна, 2006).

**Апублікаванасць**

Па тэме дысертацыйнага даследавання апублікавана 7 работ, у тым ліку 6 артыкулаў у рэцэнзуемых навуковых часопісах і перыядычных выданнях і 1 публікацыя ў зборніку матэрыялаў навуковай канфрэнцыі. Агульны аб'ём апублікаваных прац – 2 аўтарскія лісты.

**Структура дысертацыі**

Работа складаецца з уводзінаў, спіса ўмоўных абазначэнняў, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, высноў, бібліяграфічнага спіса, заўваг і двух дадаткаў. У дадатку ўваходзяць альбом ілюстрацый і алфавітны паказальнік мастакоў. Бібліяграфічны спіс уключае 197 назваў і займае 11 старонак. Альбом ілюстрацый уключае 74 адзінкі ілюстрацыйнага матэрыялу на 37 старонках. Алфавітны паказальнік мастакоў уключае 82 персаналіі і займае 12 старонак. Агульны аб'ём тэкставай часткі дысертацыі – 108 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва **Уводзінах** абгрунтоўваецца актуальнасць тэмы дысертацыйнага даследавання, выкладаецца ступень распрацаванасці яго праблематыкі, вызначаецца кола пытанняў, якія патрабуюць далейшага навуковага вывучэння.

У **Агульнай характарыстыцы работы** раскрываюцца мэты і задачы, аб'ект і прадмет даследавання, фармулюецца гіпотэза. Абазначаюцца метадалогія і метады, навуковая навізна і практычная значнасць атрыманых вынікаў. Фармулююцца асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)



Паказваецца асабісты ўклад дысертанта, ступень апрабацыі і апублікаванасці вынікаў. Вызначаюцца структура і аб'ём дысертацыі.

У **Главе 1 ("Гісторыя праблемы і характарыстыка крыніц")** разглядаюцца крыніцы ў мастацтвазнаўстве Беларусі, Расіі і іншых краін, якія ў той ці іншай ступені адлюстроўваюць даследуемую праблематыку. Аналізуюцца асноўныя этапы айчыннай навуковай і мастацтвазнаўчай думкі па тэме дысертацыйнага даследавання.

**Глава 2 "Развіццё пейзажнага жывапісу Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя (да 1917 г.)"** складаецца з трох раздзелаў. У іх разглядаюцца асноўныя вобразна-тэматычныя, відавыя і стылістычныя асаблівасці пейзажнага жывапісу Беларусі названага перыяду.

У раздзеле 2.1. **"Грамадска-палітычная і культурная сітуацыя ў Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. і асаблівасці развіцця беларускага пейзажнага жывапісу"** разглядаюцца на шырокім гістарычным фоне асаблівасці мастацкага жыцця, месца пейзажа сярод іншых жанраў жывапісу Беларусі і яго функцыі, новыя для гэтага перыяду тэндэнцыі ў беларускім пейзажы. Адзначаецца сацыяльная скіраванасць і імкненне да выяўлення нацыянальнай спецыфікі прыроды, якія характарызуюць беларускі пейзаж гэтага перыяду.

Пачатак XX стагоддзя азнаменаваўся значнымі зменамі як у грамадскім, так і ў культурным жыцці Беларусі. Развіваюцца перыядычны друк, кнігавыдавецтва, літаратура, тэатр, выяўленчае і іншыя мастацтвы. Пашыраецца выставачны рух, узмацняюцца кантакты паміж мастакамі. Імклівы рост гарадоў і фарміраванне новай гарадской культуры, пашырэнне магчымасці набыць прафесійную адукацыю як за межамі Беларусі, так і на радзіме, паспрыялі далучэнню да мастацкай дзейнасці новых творчых сіл. Развіваецца сістэма мастацкай адукацыі. Старэйшай мастацкай сярэдняй навучальнай установай застаецца мастацкая школа І.Трутнева ў Вільні. Працягвае дзейнасць заснаваная ў 1892 г. першая на тэрыторыі Беларусі прыватная мастацкая школа І.Пэна ў Віцебску. У пачатку XX стагоддзя ў Мінску адкрываецца адразу некалькі прыватных мастацкіх школ, дзейнічаюць мастацкія майстэрні ў іншых гарадах Паўночна-Заходняга краю. Пасля заканчэння сярэдніх навучальных мастацкіх устаноў многія беларусы працягвалі адукацыю ў Польшчы і Расіі – у Кракаўскай Акадэміі мастацтваў, Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства, Імператарскай Акадэміі мастацтваў у Санкт-Пецярбургу.

Адсутнасць дзяржаўнай самастойнасці, нявырашанасць нацыянальнага пытання, шматканфесійнасць і рознаскіраванасць культурных уплываў, абумоўленая месцам Беларусі на скрыжаванні еўрапейскіх шляхоў, праяўляліся ў творчай свядомасці і практыцы мастакоў. Пачатак XX стагоддзя ў развіцці беларускага пейзажа вызначаецца ўзрастаннем цікавасці мастакоў да сацыяльнай

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)



4. У беларускім пейзажным жывапісе пачатку XX стагоддзя пераважалі рэалістычныя і познеакадэмічныя рысы. Разам з тым ён, як і беларускі жывапіс у цэлым, не быў у ізаляцыі ад агульных тэндэнцый еўрапейскага мастацтва. Найбольшы ўплыў на яго зрабілі такія плыні, як імпрэсіянізм, мадэрн і сімвалізм (С.Жукоўскі, В.Бялыніцкі-Біруля, Л.Альпяровіч). Пры гэтым прыёмы мадэрна ўжываліся абмежавана, у формах, зразумелых шырокім слаям насельніцтва (Ф.Рушчыц, К.Стаброўскі, Г.Вейсенгоф, Я.Драздовіч).

У паслякастрычніцкі перыяд актыўнасць колеру, экспрэсіўнасць выяўленчых сродкаў постімпрэсіянізму ("сезанізму") найбольш адпавядалі аптымістычнаму настрою, запатрабаванаму новым часам (пейзажы І.Ахрэмчыка, М.Тарасікава, Я.Красоўскага, М.Пашкевіча, Р.Семашкевіча). З 2-й паловы 1920-ых гадоў мастацкі працэс усё больш рэгламентуецца, вынікам чаго становіцца яго уніфікацыя, перавод на рэйкі сацыялістычнага рэалізму.

Пры засваенні актуальных стылістычных прыёмаў у беларускім пейзажы заўжды прысутнічае ўстойлівасць нацыянальных традыцый. Рэалістычнае ўзнаўленне прыроды аказалася найбольш адпаведным глядацкім чаканням і патрэбам нацыянальнага мастацтва [1, 3, 5, 6].

5. Беларускаму пейзажнаму жывапісу першай паловы XX стагоддзя ўласціва выкарыстанне сімвалічных і алегарычных сродкаў выразнасці. У перыяд станаўлення беларускай нацыянальнай мастацкай школы свядомы зварот да пэўных сімвалаў менавіта ў краявідзе даваў магчымасць мастаку стварыць адначасова і індывідуальны, і шырока пазнавальны для ўсіх беларусаў незалежна ад іх сацыяльнага статуса вобраз роднай зямлі. Пры гэтым глыбокі філасофскі сэнс увасабляўся, як правіла, сімваламі, звязанымі з навакольным асяроддзем. Сістэма вобразаў, найбольш устойлівых у пейзажным жывапісе, якія набылі характар знакавых, тыповых, сугучная вобразам, якія народная свядомасць надзяляла сакральным сэнсам. Найперш гэта – зямля, асноватворны сімвал ва ўспрыманні беларуса, а таксама поле, ніва, разора, вобраз дарогі-шляху (Ф.Рушчыц, Я.Драздовіч, М.Сеўрук, П.Сергіевіч).

Пасля 1917 г. вобразны лад становіцца часткай "сацыяльнага заказу". Так, пейзажы з вобразамі вясны, раніцы, высокага гарызонту, дарогі, якая сыходзіць удалячынь, успрымаюцца як найбольш адпаведныя часу, агульнаму настрою ў грамадстве (У.Кудрэвіч, У.Хрусталёў, А.Шаўчэнка) [6].

6. Пейзажны жывапіс Заходняй Беларусі развіваўся ў іншых умовах і меў свае асаблівасці. У ім можна вылучыць такія спецыфічныя рысы, як экспрэсіўнасць колеру, блізкасць да народнага мастацтва, спалучэнне грунтоўнасці, матэрыяльнасці жывапісу і паэтычнасці бачання прыроды. (П.Сергіевіч, М.Сеўрук, Я.Драздовіч, А.Карніцкі). У пейзажах з вясковымі матывамі

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)



прысутнічае імкненне перадаць гармонію адносінаў чалавека з прыродай, прыгажосць штодзённай працы на зямлі. Пейзажны жывапіс Заходняй Беларусі пераважна рэалістычны; ён развіваўся ў рэчышчы агульных тэндэнцый еўрапейскага мастацтва і адначасова засведчыў сваімі асноўнымі рысамі неадрыўнасць ад беларускай пейзажнай школы [2, 5].

## Спіс апублікаваных работ па тэме дысертацыі

### Артыкулы ў рэцэнзуемых навуковых часопісах, перыядычных выданнях, зборніках

1. Грамыка, М. "Кожны горад павінен мець свой партрэт..." Гарадскі пейзаж у беларускім мастацтве 1900-ых – 1920-ых гадоў / М.Грамыка // Мастацтва. – 2004. – №1. – С. 42 – 45.

2. Грамыка, М. Космас, убачаны з Зямлі. Нататкі пра фантастычны пейзаж / М.Грамыка // Мастацтва. – 2004. – №9. – С. 43 – 46.

3. Грамыка, М. "Ад матываў старой вёскі – да Асінбуда!" / М.Грамыка // Мастацтва. – 2006. – №1. – С.52 – 55.

4. Грамыка, М. Мастак аднаго горада / М.Грамыка // – Мастацтва. 2006. – №4. – С.30 – 31.

5. Грамыка, М. З семафорам больш інтымнасці. Беларускі індустрыяльны пейзаж 20 – 30-х гадоў / М.Грамыка // Беларуская думка. – 2006. – №9 – С. 176 – 180.

6. Грамыка, М. "Няма таго, што раньш было..." Сядзібны пейзаж у беларускім мастацтве: Станіслаў Жукоўскі, Фердынанд Рушчыц / М.Грамыка // Роднае слова. – 2006. – №11. – С. 80 – 82.

### Матэрыялы навуковых канферэнцый

7. Грамыка, М.В. Палескі край у пейзажнай творчасці беларускіх мастакоў XX стагоддзя / М.В.Грамыка // Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся: праблемы вывучэння і захавання ў постчарнобыльскі час: зборнік навуковых артыкулаў/ рэд. кал.: А.А.Станкевіч (гал.рэд.) [і інш.]; М-ва адук. РБ, Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф.Скарыны, 2006. – С.84 – 87.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)




## РЭЗЮМЕ

Грамыка Марыя Валер'еўна

**Эвалюцыя беларускага пейзажнага жывапісу 1900 – 1941 гг.**

**Ключавыя словы**: пейзаж, жывапісны пейзаж, нацыянальны пейзаж, віды пейзажа, прырода, натура, ландшафт, пленэр, стылістычныя асаблівасці, мадэрнізм.

**Аб'ектам даследавання** з'яўляецца пейзажны жывапіс Беларусі 1900 – 1941 гг. У кола даследавання ўваходзяць арыгіналы і рэпрадукцыі твораў, біяграфіі мастакоў, рэцэнзіі і іншыя публікацыі ў тагачаснай прэсе, каталогі выставак.

**Прадметам дысертацыі** з'яўляюцца асноўныя тэндэнцыі, вобразна-тэматычныя і стылявыя асаблівасці пейзажнага жывапісу Беларусі 1900 – 1941 гг.

**Мэтай даследавання** з'яўляецца раскрыццё спецыфікі развіцця пейзажнага жывапісу ў кантэксце мастацкага і грамадскага жыцця ў Беларусі ў перыяд 1900 – 1941 гг.

**Асноўным метадам** даследавання абраны гісторыка-мастацтвазнаўчы. Пры разглядзе канкрэтных твораў выкарыстоўваліся метады стылістычнага аналізу, сістэмнага і параўнальнага аналізу.

Дысертацыя ўяўляе сабой першае абагульняючае даследаванне эвалюцыі беларускага пейзажнага жывапісу 1900 – 1941 гг. На аснове сабранага матэрыялу ўпершыню зроблена спроба комплекснага вывучэння працэсаў, якія адбываліся ў пейзажным жывапісе адзначанага перыяду.

Асноўныя палажэнні дысертацыі раскрыты ў 3 главах, якія складваюцца з 7 раздзелаў. У іх вызначана спецыфіка ролі пейзажа ў беларускім жывапісе, разгледжаны эвалюцыя традыцыйнай тэматыкі і новыя тэндэнцыі ў беларускім пейзажы, развіццё наяўных і фарміраванне новых відаў пейзажа, стылістычныя асаблівасці і сродкі мастацкай выразнасці пейзажнага жывапісу, выяўлены характэрныя рысы пейзажа Заходняй Беларусі, прасочаны працэс фарміравання перадумоў, неабходных для станаўлення нацыянальнай школы пейзажа.

Сабраны ў дысертацыі матэрыял можа стаць састаўной часткай для больш шырокага мастацтвазнаўчага даследавання беларускага пейзажнага жывапісу, можа быць запатрабаваны пры распрацоўцы лекцыйных курсаў па гісторыі выяўленчага мастацтва Беларусі, пры падрыхтоўцы выставак.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)




## РЕЗЮМЕ

Громыко Мария Валерьевна

**Эволюция белорусской пейзажной живописи 1900 – 1941 гг.**

**Ключевые слова**: пейзаж, живописный пейзаж, национальный пейзаж, виды пейзажа, природа, натура, ландшафт, пленер, стилистические особенности, модернизм.

**Объектом исследования** является пейзажная живопись Беларуси 1900 – 1941 гг. В круг исследования входят оригиналы и репродукции произведений, биографии художников, рецензии и другие публикации в прессе того времени, каталоги выставок.

**Предметом диссертации** являются основные тенденции, образно-тематические и стилевые особенности пейзажной живописи Беларуси 1900 – 1941 гг.

**Целью исследования** является раскрытие специфики развития пейзажной живописи в контексте художественной и общественной жизни в Беларуси в период 1900 – 1941 гг.

**Основным методом** исследования избран историко-искусствоведческий. При рассмотрении конкретных произведений использовались методы стилистического, системного и сравнительного анализа.

Диссертация представляет собой первое обобщающее исследование эволюции белорусской пейзажной живописи 1900 – 1941 гг. На основе собранного материала впервые предпринята попытка комплексного изучения процессов, которые происходили в пейзажной живописи названного периода.

Основные положения диссертации раскрыты в 3 главах, которые состоят из 7 разделов. В них определена специфика роли пейзажа в белорусской живописи, рассмотрены эволюция традиционной тематики и новые тенденции в белорусском пейзаже, развитие имеющихся и формирование новых видов пейзажа, стилистические особенности и средства художественной выразительности пейзажной живописи, определены характерные черты пейзажной живописи Западной Беларуси, прослежен процесс формирования предпосылок, необходимых для становления национальной школы пейзажа.

Собранный в диссертации материал может стать составной частью для более широкого искусствоведческого исследования белорусской пейзажной живописи, может быть востребован при разработке лекционных курсов по истории изобразительного искусства Беларуси, при подготовке выставок.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)




## SUMMARY

Gromyko Maria Valeryevna

## EVOLUTION OF THE BELARUSIAN LANDSCAPE PAINTING OF 1900 – 1941

**Key words:** landscape, painted landscape, national landscape, kinds of landscape, scenery, nature, countryside, plein air, stylistic features, modernism.

**The object of the research** is the landscape painting of Belarus of 1900 – 1941. The research encompasses original paintings and reproductions, the artists' biographies, reviews and other publications in the press of the period as well as catalogues of exhibitions.

**The subject of the research** is the main tendencies, thematic and stylistic features of the landscape painting of Belarus of the 1900 – 1941.

**The goal of the research** is to discover the specific character of the development of landscape painting in the context of artistic and social life in Belarus in 1900 – 1941.

**The main method** of the research is that of art-historical study. Concrete works were treated with the methods of stylistic, systemic and comparative analysis.

The dissertation is the first summarizing research of the evolution of the Belarusian landscape painting in 1900 – 1941. On the basis of the collected material, the first comprehensive study was attempted of the processes that were current in the landscape painting of the given period.

The main points of the dissertation are elaborated in 3 chapters that consist of 7 parts. They define the special role of landscape in Belarusian painting, consider the evolution of the traditional themes and the new tendencies in the Belarusian landscape as well as development of the existing and formation of new kinds of landscape, the stylistic features and means of artistic expressiveness of landscape painting. Characteristic features of the landscape painting of Western Belarus have been defined and the process has been traced how the indispensable prerequisites for the formation of the national landscape school were taking shape.

The material collected in the dissertation can become an integral part of a wider study of Belarusian landscape painting. It can be of use in developing courses of lectures on the history of the visual arts of Belarus and in preparing exhibitions.